Дзяржаўная установа адукацыі
«Лельчыцкая раённая гімназія имя і. А. Коласа»

Урок беларуская мовы ў 3 «А» класе
па тэме

# “Пытальныя сказы”

Цалка Марыя Уладзіміраўна
настаўнік пачатковых класаў
першай кваліфікацыйнай катэгорыі

2022

***Тэма урока.*** Пытальныя сказы

***Мэты урока:*** Пазнаёміць з прыметамі пытальных сказаў, іх афармленнем на пісьме, вучыць вылучаць пытальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, пра вільна інтанаваць іх; выпра цоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць лагічнае мысленне навучэнцаў, узбагачаць іх слоўнік словамі-амонімамі; выхоў ваць любоў да Радзімы

## ***ХОД УРОКА***

1. **Арганізацыйны момант.**



2. **Праверка дамашняга задання.**

1) Прачытаць з дамашняга практыкавання першыя чатыры сказы. Назваць словы, у якіх устаўлены прапушчаныя літары *д, т* або *дз, ц.*

2) Адказаць на пытанні. Адказы запісаць.

- Як тваё прозвішча?
- У якім класе ты вучышся?
- Дзе ты жывеш?

 

3. **Чыстапісанне.**

*Ба Бе Бр Бу Бы Бя*

Дапоўніць да дадзеных спалучэнняў літар склады, каб атрымаліся геаграфічныя назвы Беларусі.

*Барысаў Баранавічы Беразіна Браслаў Брэст Буда-КашалёўБыхаБярозаўка*

Паўтарэнне правапісу вялікай літары.

4. **Арфаграфічная хвілінка.**

Вучні чытаюць тэкст верша Ю.Свіркі. Замест пропуску устаўляюць назву сваёй краіны.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край, твая Айчына –
жыццё тваё і гонар твой.
І ты яе запомні імя,
як неба, сонца і зару.
Твая зямля, твая Радзіма
названа светла –
_______________.

5. **Слоўнікавая работа.**

***Беларусь***

Настаўнік прапануе вучням стаць “ мастакамі”, каб “намаляваць” з дапамогай слоў карціну нашай Беларусі.

Беларусь якая?

Сінявокая – шмат прыгожых азёр і рэк.

Зялёная – шматлікія лясы, лугі і палі.
Белая Русь – белы колер дабрыні і чысціні.
Прыгожая –
Працавітая –
Шчодрая –
Лепшая, таму што - гэта наша Радзіма.

Падзяліць запіс на словы і прачытаць сказ. Запісаць яго ў сшытку.

МЫЛЮБІМРОДНУЮБЕЛАРУСЬ

- Які сказ запісалі? Які знак прыпынку трэба паставіць?
- Чаму Беларусь называюць партызанскай краінай?

6. **Вывучэнне новага матэрыялу.**

***Работа па падручніку***

Слуханне тэксту. Вылучэнне ў ім пытальных сказаў. Знаходжанне ў вершы адказу на пытанні. Вусныя выказванні навучэнцаў пра значэнне выразу «родны край». Выбарачнае спісванне (практ. 76, с. 49—50).




Аналіз фармулёўкі правіла (с. 50).

Інтанаванне апавядальных і пытальных сказаў. Назіранні за адрозненнямі ін танацыі апавядальнага і пытальнага сказаў. Выбарачнае спісванне (практ. 77, с. 50).

Азнаямленне з правіламі інтанавання пытальных сказаў у працэсе аналізу ін фармацыі рубрыкі «Завяжы вузялок!» (с. 50).

Чытанне пытальнага сказа з рознай інтана цыяй. Назіранні за ўплывам інтанацыі на сэнс сказа. Выбарачнае спісванне (практ. 78, с. 51).

Знаёмства з правапісам слоўнікавага слова сшытак, гука-літарны аналіз яго

- Чым адрозніваюцца апавядальныя і пытальныя сказы?

- У якіх сказах тон у канцы паніжаецца, а ў якіх - павышаецца?

7. **Замацаванне ведаў.**

Практ.140 і 141 выконваюцца вусна.

***Дыферэнцыравная работа***

Разгадванне загадкі. Тлумачэнне зна чэнняў слоў-амонімаў. Спісванне з пра вільным афармленнем на пісьме пытальнага ска за (практ. 79, с. 51).

Знайсці і абазначыць пачатак і канец кожнага сказа, уставіць прапушчаныя літары, растлумачыць іх напісанне.

З падземных крыніц в..да сц..кае ў ручаі з ручаёў яна б..жыць у рэкі в..лікія рэкі ўпадаюць у моры і акіяны а куды знікае в..да з мора

8. **Падвядзенне вынікаў.**

Прачытаць услых сказы з інтанацыяй, адпаведнай знакам прыпынку.

Ты зноў спазніўся (? або .)

Хто сёння адсутнічае (?)

Вы добра ведаеце ўрок (. або ?)

9. **Рэфлексія.**

***Закончы фразу***

Я навучыўся.. .

Я даведаўся .. .

У мяне не атрымалася .. .

10. **Дамашняе заданне:** практ.80